# «РАСКРЫЙЦЕ СВАЕ СЭРЦЫ...»

Ірына Ганецкая, Алег Трусаў






Медальён з вывай св. Каятана Тыенскага. Аверс.

Медальён з вывай Святога Сямейства. Рэверс.

Фота В. Карбоўскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЮВЕЛІРНАЯ справа — адна з выдатных прафесій мастацкага рамяства, што бярэ пачатак з сівой даўніны. Але няшмат чаго збераглося, дайшло да нас. Кожная новая знаходка, што сведчыць пра высокі ўзровень умельства старажытных майстроў, становіцца падзеяй. Такая падзея адбылася летам 1993 года падчас археалагічных раскопак рэштказў былога прыходскага касцёла ў Гродне, званага «Фара Вітаўта».

Гэта нашыйны медальён, які без усялякіх агаворак можна назваць узорам высокага прафесійнага мастацтва. Рэч знаходзілася ў асобнай крыпце пад партальнай вежай касцёла з запаўненнем жоўта-чырвоным пяском і невялікімі камянямі, рэшткамі спарахнелага дрэва, мноствам каваных цвікоў рознага памеру, разрозненымі касцямі чалавечага шкілета. Апошнія тры дэталі — прыкметы пахавання. Медальён знойдзены разам з рассыпаным ружанцам: танкасценнымі полымі шарыкамі з кручочкамі, якія чапляліся адзін за адзін. На момант знаходкі ён уяўляў сабой авальнай формы злітак, пакрыты тоўстым слоем зялёнай карозіі так, што разабраць вывы было немагчыма. Пасля ачысткі аказалася[1], што захаванасць знаходкі надзвычай добрая, пацёртасцей, пашкоджанняў няма. Падобна на тое, што медальён быў надзеты на нябожчыка новым.

Медальён мае авальную форму, памерамі 2,6х3,0 см, па дыяметру ахоплены тонкай рэльефнай падвойнай рамкай. Вага — 11,1679 г; удзельная вага (8,53 г) дае магчымасць вызначыць матэрыял — латунь[2]. Зроблены медальён у тэхналогіі ліцця па васковай мадэлі. Вушка мае каплепадобную форму. Па цэнтру ў ім прасвідравана адтуліна дыяметрам 1,5 мм, у якую прадзета колца. На бакавых паверхнях і на вушку добра відаць сляды дапрацоўкі.

На аверсе медальёна размешчана паясная выява святога Іосіфа ў манаскім убранні. Фігура пададзена левым бокам да гледача ў развароце на тры чвэрці, галава — у профіль. Дакладная прамалёўка прыгожага, жыццёва-канкрэтнага твару мужчыны з вусамі і невялікай бародкай выдае руку




**Перамалёўка медальёна (рэверса і аверса) у натуральную велічыню. Мастак Н. Малчанава.**

прафесійнага мастака. Рэльефны німб вакол галавы святога абведзены выразнай лініяй і густа запоўнены маленькімі кропачкамі. Швы і складкі касцюма перададзены такім чынам, што цалкам выяўляюць фігуру. Высакародны твар асветлены лагоднай усмешкай, ціхі, замілаваны пагляд, уся ўвага яго скіравана на святое немаўля. Далоні на перакінутым ручніку беражліва трымаюць дзіцятка: левая рука пад плечкі, правая пад ножкі. Немаўля пададзена ў тым жа ракурсе, што і святы, толькі з разваротам управа. У яго твар дарослага чалавека. Вакол кучаравай галоўкі прамяністы німб. Спакой, высокая духоўнасць вызначаюць лад кампазіцыі. Па перыметру на аверсе лацінскі надпіс:

S. CAIETAN. THIEN. F.C.P.

Дык хто ж ён такі, Каятан Тыенскі? Каб высветліць гэта, нам неабходна зрабіць падарожжа ў Еўропу XV—XVI стст. Няцяжка ўспомніць, што гэта быў час магутнай хвалі Рэфармацыі, першай у Еўропе буржуазнай рэвалюцыі, рэлігійных войнаў, а на фоне гэтага — падзенне маралі ў асяродку вышэйшага каталіцкага духавенства. У сярэдзіне XV ст. па ўсёй Італіі ўзнікаюць біблейскія гурткі. Месца, дзе яны збіраліся для малітвы, называлася oratorium. Хутка гэтая назва пераходзіць на групу людзей і іх занятак. Адна з найбольш аўтарытэтных аратораў — рымская — ператвараецца ў ордэн тэацінцаў, што быў зарэгістраваны ў 1524 г. і адыграў прыкметную ролю ў пашырэнні царкоўнай рэформы. Тэацінцы строга трымаліся аскетычнага ладу жыцця, прысвяціўшы сябе палымянаму служэнню Хрысту, займаліся найперш падрыхтоўкай святароў. Заснавальнікамі ордэна былі К'еці Карафа, потым Папа Павел IV, прыхільнік строгіх метадаў перавыхавання, і св. Каятан Тыенскі (1480—1547), які ўласным прыкладам любові і дабрыні заклікаў святароў, што вялі бездухоўнае жыццё, да пераасэнсавання і змянення свайго ўнутранага ладу, да абнаўлення. Усё сказанае, ды і самі словы св. Каятана Тыенскага: «Маліцеся, каб увесь свет лёг на вас цяжарам дзеля вашага ўратавання», а таксама са статута рымскай араторыі: «Засяваць і гадаваць у сэрцах боскую любоў»[3], — дапамагаюць глыбей зразумець сэнс і сімволіку, адчуць настрой выявы.

На рэверсе бачым Святое Сямейства. Марыя сядзіць на крэсле. Мафорый, што пакрывае яе галаву, спускаецца па плячах і перакінуты праз калені. На ім сядзіць дзіцятка, яно даверліва і непасрэдна цягнецца да кветкі, водар якой удыхае св. Дзева. Іосіф ідзе насустрач, нешта прамаўляючы да Марыі, у левай руцэ трымаючы кнігу. Фігуры іх так па-майстэрску ўпісаны ў авальную форму вырабу, што не адразу звяртаеш увагу на тое, што яны амаль аднолькавыя па памерах, хоць адна з іх пададзена ў поўны рост (Іосіф), другая — седзячы (Марыя). Характэрны ракурс: тры чвэрці з паваротам галавы ў профіль. Распрацоўка складак убрання дакладна выяўляе аб'ём цэлаў, позы, рухі святых. Твары іх цяжка назваць лікамі: яны цалкам рэалістычныя, жывыя, выяўляюць узрост, эмацыянальны стан. Усе тры персанажы ўспрымаюцца як адно цэлае, паміж імі адчуваецца непарыўная сувязь; дынамічны і ў той самы час спакойны рытм рухаў, жэстаў, позаў ідзе як бы па закручанай спіралі: ад кнігі праз раскрытую правую руку Іосіфа перадаецца да Марыі і, далей, да маленькага Ісуса, замыкаючыся на ім. Адчуванне гэтага ўнутранага дынамізму, кругазвароту дасягаецца рухомасцю контураў, узмацняецца трактоўкай складак адзення, крутым валютападобным завіткам крэсла. Ствараецца ўражанне бясконцага перацякання нейкай няўлоўнай прасветленай энергіі. Уся сцэна выпраменьвае Любоў і Дабрыню. На фоне ўмоўна пазначаны пейзаж. Па перыметру чытаем надпіс: IESUS. MAR. IOSEP.

Нельга ўтрымацца, каб не выказаць захаплення надзвычайным умельствам майстра. Глыбокая вобразная сіла, мастацкая выразнасць, бездакорная кампазіцыя, прапорцыі, дасканалая пластыка, тонкая мадэліроўка, вытанчанасць форм, напоўненых энергічным рытмам і дзівоснай гармоніяй. Ужо каторы раз бярэш у рукі гэты цудоўны твор і са здзіўленнем заўважаеш усё новыя дэталі: пальчыкі ручак маленькага Хрыста, пялёсткі кветкі, раменьчыкі ад сандаляў і гэтак бясконца. Кожная дэталь увасоблена старанна, ювелірна, па-мастацку, а галоўнае — з любоўю. Тэхнічнае майстэрства ў спалучэнні з духоўнасцю мастака далі выдатны плён.

Цяпер прааналізуем падставы для датавання. Касцёл быў пабудаваны езуітамі ў 1586—1587 гг. XVII стагоддзе было найбольш спрыяльным перыядам у яго гісторыі. У XVIII ст. касцёл перажываў свае далёка не лепшыя часы: моцнае разбурэнне падчас Паўночнай вайны, два пажары, адсутнасць сродкаў на рамонт. У 1807 г. ён быў пераўтвораны ў праваслаўны храм[4]. Брацкія пахаванні пад цэнтральным нефам у той частцы, што бліжэй да партала, датуюцца манетамі: білонавым солідам Жыгімонта III Вазы (1586—1623) добрай захаванасці і медным солідам-барацінкай XVII ст. (вельмі пацёрты). Пахаванне ў крыпце з нашай знаходкай зроблена прыкладна адначасова. З самага пачатку XVII ст. ў Еўропе назіраецца росквіт рэлігійнага жыцця. Актыўна дзейнічаюць езуіты, нараджаюцца новыя культы, звязаныя з ушанаваннем Хрыста; верагодна, менавіта ў гэты час пашыраецца культ св. Каятана Тыенскага, прычым найхутчэй у езуіцкім асяроддзі. Тэматыка кампазіцый, сістэма выяўленчых сродкаў дазваляюць разглядаць медальён у якасці яскравага ўзору ідэалогіі і эстэтыкі барока — пласта культуры, што сфарміраваўся на грунце магутнай хвалі контррэфармацыі. Такім чынам, аналіз гісторыка-археалагічных і мастацка-стылістычных асаблівасцей падводзяць нас да датавання XVII стагоддзем.

Пра месца вытворчасці медальёна сказаць што-небудзь больш-менш пэўнае цяжка — няма матэрыялу. Магчыма, гэта імпарт, але не выключана і мясцовае паходжанне.

Уяўляецца сімвалічным, што медальён знойдзены цяпер, калі востра адчуваецца неабходнасць адраджэння веры, ідэалаў хрысціянскай маралі, а ідэйна-вобразны лад сцэнаў гучыць нібы запавет: «Раскрыйце свае сэрцы любові і дабрыні».



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

[1] Рэстаўрацыя медальёна зроблена мастаком-рэстаўратарам Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі У. Кіслым.

[2] Вызначэнне Т. Галковай, лабараторыя паліфосфарных злучэнняў ІАНХ АН Беларусі.

[3] Хольц Офм Леонард. История христианского монашества. СПб. 1993. С. 171—199.

[4] Трусаў І. Гісторыка-архіўныя і бібліяграфічныя даследаванні «Фары Вітаўта» ў Гродне // Архіў БРПІ.